УДК 821.161.3

**П. Р. Кошман**
Кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай і рускай філалогіі,
УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, г. Мазыр, Беларусь

# АСАБЛІВАСЦІ БУДОВЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ВОБРАЗА СВЕТУ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ ТРАДЫЦЫІ

*У артыкуле разглядаецца будова нацыянальнага вобраза свету ў беларускай літаратурнай традыцыі, вызначаецца пераемнасць у яго структуры вобразаў-архетыпаў і літаратурных этнавобразаў, паказваецца ўзаемадзеянне лакальнага і агульнанацыянальнага ўзроўняў мастацкага спасціжэння свайго свету, раскрываюцца асноўныя падыходы да ўспрымання свету чужога.*

*Ключавыя словы: нацыянальны вобраз свету, архетып, літаратурны этнавобраз, літаратурная імагалогія, беларуская літаратура.*

## Уводзіны

На мяжы XX і XXI стагоддзяў у сферы традыцыйнай літаратуразнаўчай праблематыкі, звязанай з пазнаннем нацыянальнай спецыфікі мастацтва слова, асаблівую ўвагу даследчыкаў прыцягнулі магчымасці нацыянальных літаратур у выяўленні і фарміраванні светапогляднай асновы тых людскіх супольнасцей, да якіх яны належаць. Прызнанне каштоўнасці культурнай разнастайнасці чалавецтва, зробленае ў гэты час у кантэксце супрацьстаяння працэсам глабалізацыі, садзейнічала актуалізацыі ў навуковым дыскурсе тэмы рэпрэзентацыі нацыянальнага быцця мастацтвам слова і замацаванню за ёй статусу аднаго з прыярытэтных даследчыцкіх кірункаў сучаснага параўнальнага літаратуразнаўства. У апошняе дзесяцігоддзе яго ўкраінскімі (Д. Налівайка, В. Будны) і расійскімі прадстаўнікамі (В. Хараў, В. Зямскоў, А. Палякоў) актыўна распрацоўваецца праблемнае поле літаратурнай імагалогіі – новай галіны кампаратывістыкі, прадметам даследавання якой з'яўляюцца вобразы свайго нацыянальнага свету і свету прадстаўнікоў іншых нацыянальных супольнасцей. Мэта дадзенага артыкула заключаецца ў тым, каб, выкарыстоўваючы тэарэтыка-метадалагічныя падыходы літаратурнай імагалогіі, вызначыць у кантэксце развіцця беларускай літаратурнай традыцыі асаблівасці структуры нацыянальнага вобраза свету.

## Вынікі даследавання і іх абмеркаванне

У практыцы даследавання катэгорыі мастацкага вобраза заўсёды лічыцца важным адзначыць тую адметную частку яго зместу, якая выяўляе індывідуальнасць творчага мыслення пісьменніка. У сваю чаргу праблема ўвасаблення нацыянальнага вылучае ў мастацкім вобразе той узровень непаўторнасці, які абумоўлены шэрагам пэўных жыццёвых абставін, што звязваюць аўтара з унікальным культурным і прыродным асяроддзем. Як і кожны чалавек, пісьменнік фарміруецца пад уплывам канкрэтнага часу, мясцовасці, акаляючага грамадства, а таму адлюстроўвае праз уласнае бачанне свету не толькі асабістыя, але і тыя агульныя ўяўленнямі, якія ўказваюць на яго прыналежнасць да людской супольнасці і залежнасць ад яе калектыўнага досведу. Гэтае светапогляднае адзінства найлепш раскрываецца ў кантэксце літаратурнай традыцыі, выяўляе сябе праз увагу розных пакаленняў пісьменнікаў да адных і тых жа дэталей, тэм, праблем і характарызуецца ўстойлівасцю дадзеных ім ідэйна-эстэтычных ацэнак.

Узятыя паасобку ў мастацкім творы носьбіты нацыянальнага сэнсу, могуць быць разгледжаны як каларытная мастацкая дэталь, этнаграфічны кампанент, фальклорны або міфалагічны матыў, этнічны стэрэатып, топас і г. д. Разам з тым агульная функцыянальная скіраванасць дадзеных элементаў на фарміраванне цэласнага ўяўлення пра быццё нацыі абумоўлівае неабходнасць вызначэння для іх адмысловага літаратуразнаўчага паняцця. З гэтай нагоды заслугоўвае ўвагі тэрмін "літаратурны этнавобраз", пад якім украінскі навуковец В. Будны прапануе разумець "такі літаратурны вобраз, які канструюе не толькі індывідуальныя рысы, але і этнічную (нацыянальную) ідэнтычнасць выяўленых персанажаў, краявідаў або гістарычнага

© Кошман П. Р., 2016

МГПУ им. И.П.Шамякина

мінулага, падаючы пэўныя іх прыкметы як "тыповыя" для дадзенай краіны, "характэрныя" для цэлага народа" [1].

Літаратурныя этнавобразы з'яўляюцца базавымі элементамі выражэння нацыянальнага бачання свету, тымі шматлікімі кропкамі апоры, на якіх выбудоўваецца ідэнтыфікацыя нацыі ў гістарычнай і геаграфічнай карцінах свету, а таксама ў адносінах з іншымі супольнасцямі. Узаемасувязь літаратурных этнавобразаў, прадстаўленых у мастацкай традыцыі пэўнай нацыі ў колькасці, дастатковай для таго, каб рэпрэзентаваць спецыфіку яе супольных уяўленняў пра чалавека і грамадства, прастору і час іх быцця, вызначае ў нашым разуменні змест паняцця "нацыянальны вобраз свету". Уласна кажучы, даследаванне нацыянальнага вобраза свету ў мастацкай літаратуры – гэта вылучэнне ў існуючым мностве індывідуальна-аўтарскіх варыянтаў асэнсавання рэчаіснасці тых канцэптаў, якія сведчаць аб светапоглядным адзінстве пісьменнікаў як прадстаўнікоў адной нацыянальнай супольнасці.

Пошук у літаратурнай традыцыі адзнак калектыўнага светапогляду прыцягвае ўвагу даследчыкаў нацыянальнай праблематыкі да паняцця архетып, уведзенага ў навуковы ўжытак псіхолагам К. Юнгам для вызначэння вобразаў калектыўнага бессвядомага. У сучаснай гуманітарнай навуцы архетыпы разглядаюцца "ў якасці ўстойлівых структур апрацоўкі, захавання і рэпрэзентацыі калектыўнага вопыту" [2, 30] і падзяляюцца на ўніверсальныя, якія ўласцівы ўсяму чалавецтву, і этнічныя, якія "адлюстроўваюць і адначасова ў пэўным сэнсе вызначаюць адметныя рысы ментальнасці, характару, гістарычнага лёсу таго ці іншага народа" [2, 31].

Натуральнай сферай бытавання архетыпаў з'яўляецца міфалагічная і фальклорная спадчына, трапляючы ў літаратуру, яны становяцца мастацкім сведчаннем быцця нацыі, яе адзінства і ўстойлівасці развіцця. Я. Гарадніцкі, напрыклад, адзначае наяўнасць такіх сувязей з "адвечнымі мадэлямі светаўладкавання" [3, 59] ў творах Я. Купалы на тэматычным, вобразным і нават рытміка-інтанацыйным узроўнях. Апошняе ўяўляецца асабліва складаным для даследавання, бо ў крытэрыях ацэнкі вартасці паэтычнага стылю такія рысы, як арыгінальнасць, індывідуальнасць, цалкам пераважаюць над пераймannем. Больш відавочным для выяўлення тыпалогіі нацыянальнага з'яўляецца той вобразны і тэматычны ўзровень, на якім і адбываецца узаемадзеянне вобразаў-архетыпаў і згаданых вышэй літаратурных этнавобразаў. Па сутнасці, гэтыя два рэпрэзентатыўныя элементы нацыянальнага ў мастацкім слове маюць блізкі змест, адлюстроўваюць адзнакі духоўнага і матэрыяльнага быцця адной і той жа людской супольнасці, выконваюць аднолькавыя задачы. Розніца паміж імі абумоўлена тым, што архетып абавязкова мае міфалагічнае паходжанне і глыбокую традыцыю бытавання, у той час як літаратурны этнавобраз азначае больш шырокае паняцце, можа быць вынайдзены аўтарам і, адпаведна, мець бачную гісторыю мастацкага асэнсавання.

Структура нацыянальнага вобраза свету выбудоўваецца ў літаратуры такім чынам, што яе падмурак складаецца менавіта з тых пракаветных, устойлівых уяўленняў, якімі з'яўляюцца архетыпы. Увасобленыя ў мастацкай традыцыі, яны перастаюць быць неўсвядомленымі вобразамі, паколькі з часам раскрываюць сваю значнасць і пачынаюць цалкам свядома ўжывацца для рэпрэзентацыі нацыянальнага свету. Так, пісьменнікі Беларусі XIX ст., закладаючы асновы нацыянальнай мастацкай свядомасці праз перайманне вобразаў і матываў мясцовага фальклору, нанеслі першыя адценні беларускасці на такія важныя вобразы-архетыпы, як лес, курган, зямля, родная хата. Адштурхоўваючыся ад гэтай архетыповай асновы, працэс далейшага асваення акаляючага свету, "беларусізацыі" яго духоўнай і матэрыяльнай частак дазволіў айчыннай літаратуры адкрываць ужо новыя арыгінальныя, раней не спазнаныя вобразы (беларус-селянін, родная мова, васількі, скрыжаванне дарог і інш.), якія сталі знакавымі для беларускай нацыянальнай супольнасці.

Беларуская літаратура XIX – пачатку XX ст. з'явілася той творчай пляцоўкай, на якой адбывалася фарміраванне мастацкай мадэлі беларускага свету, вызначаліся яго геаграфічныя і гістарычныя параметры, апрабоўваліся розныя варыянты ідэйна-эстэтычнага іміджу. Натуральна, што з таго часу ў мастацкім успрыманні сябе (аўтавобраз) адбыліся пэўныя змены. Архетып зямлі на сённяшні дзень, напрыклад, аказаўся больш звязаным з экалагічнай тэматыкай і не мае таго сацыяльнага зместу ў выражэнні нацыянальнага светабачання, якім ён валодаў у беларускай літаратуры пачатку XX ст. У сваю чаргу вобраз шляхціца пазбавіўся ад традыцыі адназначнага негатыўнага ўспрымання і заняў належнае месца ў сучаснай гістарычнай прозе сярод пазнавальных нацыянальных персанажаў. Гэтыя і іншыя перамены сведчаць, што афармленне нацыянальнага вобраза свету залежыць ад гістарычных абставін, але самі элементы яго

МГПУ им. И.П. Шамякина

канструкцыі не знікаюць бясследна. Як відаць, традыцыя асэнсавання аўтавобраза мае той самы характар "напластавання", які быў вызначаны В. Зямсковым у дачыненні да вобраза *іншага* свету. "Старое, – па словах даследчыка, – ніколі не знікае і заўсёды можа ўзнікнуць з глыбінь гісторыі ў абставінах, якія актывізуюць памяць рэцыпіента аб "іншым", і ў тым, што датычыцца яго "станоўчых", і ў тым, што датычыцца яго "адмоўных" бакоў" [4].

Пачатак традыцыі напаўнення мастацкай формы нацыянальным зместам быў звязаны ў беларускай літаратуры найперш з эстэтызацыяй мясцовай прыроды. У свой час М. Багдановіч, праводзячы прамую аналогію паміж адзнакамі беларускага ландшафту і вартасцямі беларускай літаратуры, указваў на неабходнасць забеспячэння своеасаблівай пераемнасці паміж імі. "Край беларускі, – казаў паэт, – лясісты і балоцісты. Вось нам і трэба стварыць паэзію лесу, паэзію дрыгвы. Украінская стыхія – стэп, у нас наша стыхія – лес і балота. Тут ёсць свая адменная краса, адменная рытміка, адменны чар. Трэба іх падглядзець, знайсці і вынесці на шырокі свет..." [5, 27]. У мастацкай літаратуры замацаваўся тыповы беларускі краявід, прадстаўлены малюнкам асвоенай чалавекам прасторы (сялянскі двор, ралля, жніво і інш.), з якой непасрэдна мяжуюць вобразы некранутай прыроды – лес, балота, рака. Дадзены пейзаж не толькі акрэсліў тую прастору, якая была асэнсавана беларускім этнасам як свая ўласная, але і ўвасобіў у суладнасці існавання тутэйшага чалавека і навакольнага свету канцэптуальную аснову нацыянальнага быцця.

Выяўленне гармоніі чалавека і прыроды, абумоўленае ў многім захаванасцю ў фальклоры беларусаў рэшткаў пантэістычнага светаўспрымання, стала адметнай рысай айчыннай мастацкай свядомасці і адной з найважнейшых характарыстык, дадзеных ёю вобразу свайго свету. Непасрэдна ў прасторавай праекцыі мастацкай мадэлі нацыянальнага быцця яна арганічна суаднеслася з пісьменніцкім культам малой радзімы. Воблік вядомых з дзяцінства мясцін, цесна знітаваны ў памяці з гэтай шчаслівай парой, звычайна ідэалізаваўся аўтарамі, увасабляў свой натуральны, "прыродны" ўклад жыцця ў процівагу іншаму, вялікаму свету людской цывілізацыі. Дадзенае супрацьпастаўленне прасочваецца ў многіх знакавых для рэпрэзентацыі нацыянальнага свету творах. Засценак шляхціца Завальні Я. Баршчэўскага, леснікова сядзіба Якуба Коласа, "роднае карэнне" Малой Багацькаўкі М. Гарэцкага, палескія Курані І. Мележа – гэта далёка няпоўны шэраг тых хрэстаматыйных тапанімічных вобразаў, якія засведчылі прыярытэт рэгіянальнага ў асэнсаванні беларускай літаратурай сваёй Бацькаўшчыны і адначасова замацавалі ў змесце гэтага вобраза рысы патрыярхальнасці і нават правінцыйнасці. Заўважым, што ў святле кансерватыўнага беларускага менталітэту такая афарбоўка не аказвала негатыўнага ўплыву на імідж роднага краю, а наадварот, выглядала пераважна яго станоўчай характарыстыкай.

Беларуская літаратура назапасіла вялікую колькасць унікальных гісторыка-геаграфічных вобразаў, з абсягамі якіх аўтары ідэнтыфікавалі сябе, атаясамлівалі свой свет. Аднак уявіць на іх аснове адзіны вобраз Радзімы дастаткова складана па прычыне яго шматмернасці, мазаічнасці. Апафеоз малой радзімы, нягледзячы на ўласцівы яму шчыры патрыятызм, абмяжоўваў разуменне *свайго* лакальнымі маштабамі і тым самым стрымліваў выпрацоўку ў літаратурнай традыцыі агульнага панарамнага бачання нацыянальнага свету. Прынамсі, тая перманентная для беларускай мастацкай свядомасці перавага, якой пры вызначэнні найважнейшай кропкі сусвету валодае ў вачах пісьменніка край яго маленства, падмяняла сабой доўгі час вырашэнне пытання аб цэнтры нацыянальнага свету. У ХХ ст. на гэтую ролю эпізадычна вылучаліся пісьменнікамі такія значныя ў беларускай гісторыі гарады, як Полацк, Вільня, Гародня. Пачынаючы з другой паловы мінулага стагоддзя, беларуская літаратура паступова засяроджвае ўвагу на вобразе Мінска, аддаючы тым самым належнае сталічнаму статусу горада, а таксама яго ролі ў нядаўніх падзеях Вялікай Айчыннай вайны ("Гандлярка і паэт", "Сэрца на далоні" І. Шамякіна, "Мінскі напрамак" І. Мележа). У межах эпічнага асэнсавання гэтай тэмы, што выконвала ў савецкі час функцыю аднаго з галоўных індыкатараў беларускасці, сталіца краіны стала ўспрымацца сімвалам гераізму і трагедыі ўсяго беларускага народа. Такім чынам, вобраз Мінска, на наш погляд, упершыню, замацаваўся ў тым агульнанацыянальным ідэалагічным кантэксце, захаванне і актуалізацыя ў якім працягваецца беларускай літаратурай і па сённяшні дзень.

Звяртае ўвагу на сябе той факт, што праблема вылучэння цэнтра непасрэдна актывізуе гістарычнае вымярэнне мастацкай мадэлі свайго свету. Агульнанацыянальны статус вобраза сталіцы, яго цывілізацыйная семантыка ў адрозненне ад пазачасавага правінцыйнага вобраза малой радзімы грунтуецца не на асабістай біяграфіі аўтара, хаця і не выключае яе, а на ўсведамленні агульнага гістарычнага лёсу народа. У сістэме нацыянальных уяўленняў аб часе свайго існавання, дзе ўзнікненне кожнага горада ўспрымаецца як важная падзея мінулага,

МГПУ им. И.П.Шамякина

вылучэнне сталіцы ў цэлым азначае пачатак нацыянальнай гісторыі. Памяць нацыі, уяўленне ёю свайго супольнага гістарычнага вопыту звычайна абапіраецца на тыя часы, калі яе як усвядомленай людской супольнасці яшчэ не існавала. Паэтычныя фраза Р. Барадуліна "ад Полацку пачаўся свет" – выдатна перадае тую прасторавую і часавую дамінанту, з якой у айчыннай літаратурнай традыцыі звязваюцца вытокі беларускасці. Яе храналагічнае напаўненне непасрэдна аказваецца знітаваным са знакавымі падзеямі мінулага: перамогамі і паражэннямі Вялікага Княства Літоўскага, паўстаннем 1863 года, калектывізацыяй і рэпрэсіямі, Вялікай Айчыннай вайной, чарнобыльскай аварыяй і постчарнобыльскім жыццём. Усе гэтыя вобразы з'яўляюцца рэпрэзентатыўнымі гістарычнымі мадэлямі нацыянальнага вобраза свету, тымі яго базавымі элементамі, якія змяшчаюць вельмі важныя для нацыянальнай ідэнтычнасці міфалагічныя канструкцыі пра паходжанне нацыі, яе залаты век, страчаны рай і перажытую трагедыю.

Выяўленне цэнтра свайго свету і пункта адліку яго гістарычнага часу з'яўляецца асновай цэласнасці структуры аўтавобраза, у той час як цалкам завершаны воблік надае яму катэгорыя мяжы. Уласна кажучы, вобраз свайго свету заканчваецца там, дзе пачынаецца свет *іншы, чужы*, без існавання гэтага *другога* немагчыма ўсвядоміць *сябе*. У прасторавым аспекце гэта азначае асэнсаванне вобраза іншай краіны, якое адбываецца на аснове супастаўлення з ведамі і ўяўленнямі пра свой родны край і такім чынам з'яўляецца дастаткова суб'ектыўным . Зручны мастацкі ход для выяўлення вобраза іншай краіны, правядзення мяжы паміж сваім і чужым прадстаўляюць у літаратуры прыгодніцкія і падарожныя сюжэты, у якіх ствараецца сітуацыя непасрэднага дакранання да свету іншага. Аднак нацыянальная мастацкая свядомасць вызначаецца этнацэнтрычнасцю і толькі зрэдку скіроўвае свой погляд на іншыя краіны. Нягледзячы на важныя ў гэтым плане для беларускай літаратуры творы ("Жыцие Еўфрасінні Полацкай", "Авантуры майго жыцця" С. Пільштыновай, прыгодніцкія аповесці Я. Маўра), экзатычны вобраз "іншага" ў ёй не замацаваўся. Адметнасць трактоўкі беларускімі аўтарамі іншых краін добра перадае паэтычны афарызм "каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць". Эмацыянальнай дамінантай успрымання вобраза чужбіны ў беларускай літаратурнай традыцыі з'яўляецца не захапленне яе інакшасцю, а тое пачуццё адарванасці ад сваёй радзімы, якое добра вядома беларускаму чытачу па паэме "Песня пра зубра" М. Гусоўскага ці "Крымскіх санетах" А. Міцкевіча.

У айчыннай літаратурнай традыцыі вобраз іншага часцей за ўсё раскрываецца ў кантэксце асэнсавання аўтарамі зместу свайго свету, паўстае ў якасці таго чужароднага элемента, з дапамогай якога лепш праяўляецца беларускасць. У гэтым плане арыгінальнай спробай пазнання зместу роднага краю з'яўляецца яго выяўленне ў выглядзе той незвычайнай, экзатычнай краіны, якой яна бачыцца прадстаўнікам іншых этнасаў ("Сівая легенда" У. Караткевіча, "Сны імператара" У. Арлова). Аднак успрыманне постаці іншага ў беларускай літаратуры пераважна абумоўлена міфалагічнай карцінай свету, у адпаведнасці з якой дадзены вобраз рэзка супрацьпастаўляецца вобразу "Я", вызначаецца негатыўнай семантыкай, дэманізуецца. Такі падыход ляжыць у аснове літаратурнай традыцыі выяўлення чужога (вобразы чарнакніжніка і Белай Сарокі ў аповесці "Шляхціц Завальня" Я. Баршчэўскага) і да сённяшняга часу застаецца эфектыўным сродкам актуалізацыі пачуцця нацыянальнага самазахавання, пра што сведчаць аповесці сучасных беларускіх аўтараў: Ю. Станкевіча "Любіць ноч – права пацукоў", Ф. Сіўко "Удог".

**Вывады**

Такім чынам, структура нацыянальнага вобраза свету ў беларускай літаратуры характарызуецца наяўнасцю дзвюх мадэлей яго мастацкага ўвасаблення: канцэпту малой радзімы, афармленага пераважна ў выніку пераймання светапогляднай народнай традыцыі, і вобраза Беларусі, звязанага з вылучэннем аўтарамі катэгорыі агульнанацыянальнай самабытнасці. Іх ўзаемадзеянне дазволіла выявіць у літаратурнай традыцыі тыя светапоглядныя і гісторыка-геаграфічныя арыенціры, якія вызначаюць аснову беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці.

СПІС АСНОЎНЫХ КРЫНІЦ

1. Будний, В. Розгадка чарів Цірцеї: національні образи та стереотипи восвітленні літературної етноімагології : [Електронний ресурс] / В. Будний // Слово і час. – 2007. – № 3. – Рэжым доступу : http://dspace.nbuv.gov.ua/bitstream/handle/123456789/11392/07-Budnyy.pdf. – Дата доступу : 30.09.2016.

МГПУ им. И.П. Шамякина

2. Дубянецкі, Э. С. Архетып культурны / Э. С. Дубянецкі // Культуралогія: Энцыклапедычны даведнік / Э. С. Дубянецкі. – Мінск : БелЭн, 2003. – С. 30–31.

3. Гарадніцкі, Я. Паэтыка беларускай літаратуры XX стагоддзя: суб'ектыўна-аб'ектыўныя адносіны / Я. Гарадніцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – 322 с.

4. Земсков, В. Б. Образ России «на переломе» времен (Теоретический аспект: рецепция и репрезентация «другой» культуры) / В. Б. Земсков // Новые российские гуманитарные исследования. Литературоведение. – 2006. – № 1. – Рэжым доступу : http://www.nrgumis.ru/articles/archives/full_art.php?aid=37&binn_rubrik_pl_articles=246. – Дата доступу : 30.09.2016.

5. Ластоўскі, В. Мае ўспаміны аб М. Багдановічу / В. Ластоўскі // На суд гісторыі: успаміны, дыялогі / уклад. Б. І. Сачанка. – Мінск : Маст. літ., 1994. – С. 24–31.

*Поступила в редакцию 06.10.16*

E-mail: pauloko7h@jmail.com

P. R. Koshman

## PECULIARITIES OF NATIONAL IMAGE OF THE WORLD BUILDING IN THE BELARUSIAN LITERATY TRADITION

The article is devoted to building of national image of the world in the Belarusian literary tradition; continuity in the structure of images- archetypes and literary ethno-images is observed; cooperation of local and general national levels of artistic discovery is shown; basic approaches to view of strange world are determined.

Keywords: National image of the world, archetype, literary ethno-image, literary imagology, Belarusian literature.

МГПУ им. И.П.Шамякина